НЮАНСЫ ПАЛЯВАННЯ НА ПТУШЫНУЮ ДЗІЧЫНУ 4

«МЕНЮ» НЯЎДАЛАЙ ПРАКТЫКІ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

17 САКАВІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 51 (29931)

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў:

«Меркаванне моладзі абавязкова трэба ўлічваць, у тым ліку пры падрыхтоўцы праектаў заканадаўчых актаў. Таму што сённяшняя моладзь — гэта заўтрашняя будучыня краіны. Часта яны бачаць тое, што не бачыць старэйшае пакаленне. Наша грамадства — гэта сукупнасць і маладых, і пажылых. І ў кожнага ёсць свае крупінкі правільных думак, ідэй».

СПАРТЫЎНАЯ ВЯРШЫНЯ — НА РАДЗІМЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Крысціна ЗУЕВА — трэнер па самба ўшацкага фізкультурна-аздараўленчага комплексу — пасля заняткаў праводзіць з малодшай групай агульную падрыхтоўку ў басейне. Дзяўчына скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт фізічнай культуры і спорту. Пасля размеркавання яе хацелі пакінуць працаваць у сталіцы, але Крысціна вярнулася на малую радзіму ва Ушачы і не шкадуе. Яе прызванне — працаваць трэнерам і выхоўваць будучых чэмпіёнаў. Крысціна Зуева ўжо не раз дасягала спартыўных вяршынь, была прызёркай чэмпіянату свету і пераможцай у чэмпіянаце Беларусі, таму свой трэнерскі і спаборніцкі досвед хоча перадаць юным землякам.

КАРАТКА

- **Акцыя «Дзіця — галоўны пасажыр!» пройдзе ў Беларусі з 17 да 27 сакавіка.**
- Стадыён і спарткомплекс у Магілёве абновяць да II Гульняў краін СНД.
- **ДПК: на працягу месяца літоўскі бок прапускаў на сваю тэрыторыю 50 % грузавікоў ад нормы.**
- Мінлясгас абсталюе сем новых гандлёвых пляцовак да 1 ліпеня.

- **КДК да 22 сакавіка прымае паведамленні аб парушэннях прыродаахоўнага заканадаўства.**
- У Гомельскай вобласці пры расследаванні справы аб генацыдзе знайшлі яшчэ 151 месца расстрэлаў людзей.
- **Беларускія зоркі эстрады маюць намер правесці ў Расіі серыю канцэртаў з патрыятычным акцэнтам.**

Сітуацыя

«Ваш нумар дала сяброўка, купіце ў нас пыласос»

Як пазбавіцца ад рэкламных званкоў на мабільны

«Вітаю! Скажыце, я дазванілася ў Мінск?» Такім трывіяльным выразам пачынаюцца хіба што не ўсе званкі, падчас якіх абанента хочуць некуды запрасіць або нешта яму прапанаваць. І калі адзін адразу пакладзе трубку, іншы ўважліва выслухае, а то, можа, і сходзіць на прэзентацыю «дзіва-пыласоса», у падарунак да якога ідзе спецыяльная супрацьпылавая хустка для валасоў падчас прыборкі. І мала хто пачне высвятляць у суразмоўніка, адкуль у таго асабісты нумар вашага мабільнага. Між тым менавіта гэта варта зрабіць найперш, бо з пункту гледжання Закона аб абароне персанальных даных такія «халодныя» званкі з рэкламай без вашай на іх згоды — незаконныя. Як вымусіць дакучлівага менеджара вам больш не званіць і як даведацца, хто ўвогуле атрымлівае вашы персанальныя даныя, расказалі ў Нацыянальным цэнтры абароны персанальных даных (НЦАПД).

СТАР. 3

Напярэдадні сезона

ПАЎНОЧНЫ ВІНАГРАД

Хто і навошта вырошчвае «лазу даўгалецця» ў Беларусі?

Турыстычныя даведнікі любяць уключаць у апісанні той ці іншай краіны звесткі, якія пачынаюцца з займенніка «самы»: самы паўночны або паўднёвы пункт, самая вялікая колькасць азёраў, балот, горных вяршынь... У прынцыпе звестак, якія пачынаюцца са слова «самы», пры жаданні можна знайсці нямала аб кожнай краіне свету. І Беларусь — не выключэнне.

Беларускі вінаград смачнейшы за імпартны, адзначаюць і спажыўцы, і навукоўцы.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2023 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Гэта грошы народныя і павінны выкарыстоўвацца на патрэбы людзей»

Эканомія бюджэтных сродкаў стала тэмай нарады ў кіраўніка дзяржавы

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную эканоміі бюджэтных сродкаў. Удзел у ёй узялі віцэ-прэм'ер Пётр Пархомчык, кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый Назараў, кіраўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка і Камітэта Дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў, губернатар Мінскай вобласці Аляксандр Турчын і міністр фінансаў Юрый Селівёрстаў.

«Калі мы часам эканомім бюджэтныя сродкі, то ўзнікаюць, як у савецкія часы іх называлі, нейкія «падснежнікі». То мы людзей трымаем на вытворчасці, яны працуюць на бюджэтную арганізацыю, то мы выкарыстоўваем транспарт небюджэтнай арганізацыі і выкарыстоўваем гэты транспарт для вырашэння пытанняў бюджэтнага характару. А дакладней, нейкія пытанні не вырашаюцца ў бюджэтным плане, а начальнікі патрабуюць аўтамабілі з падпарадкаваных прадпрыемстваў дзяржаўнай і прыватнай формы ўласнасці, каб вырашаць нейкія асабістыя пытанні. Гэта паводле той інфармацыі, якую я атрымліваю ў апошні час», — сказаў Прэзідэнт.

Ён акцэнтаваў увагу на тым, што бюджэтныя сродкі трэба накіроўваць туды, куды трэба. «Гэта грошы народныя, прадпрыемствы іх плацяць і людзі падаходны падатак плацяць. Гэта грошы народныя і гэтыя грошы павінны выкарыстоўвацца на патрэбы нашых людзей», — канстатаваў беларускі лідар.

Валерыя СЦЯЦКО.

«Мы людзі добрасумленныя і адказныя»

Прэзідэнт абмеркаваў з Віктарам Шэйманам супрацоўніцтва ў Афрыцы

Таксама Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу са спецыяльным пасланнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Віктарам Шэйманам, які курыруе развіццё супрацоўніцтва з краінамі Афрыканскага кантынента.

«Генералаў былых не бывае і былых службовых асоб таксама, таму, нягледзячы на нейкую свабоду і самастойнасць, Афрыка засталася за табой як у спецыяльнага пасланніка Прэзідэнта», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён спытаў, як развіваецца супрацоўніцтва з краінамі Афрыканскага кантынента пасля візіту ў Зімбабвэ, Аб'ядналыя Арабскія Эміраты. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што наладжаны дамоўленасці з кітайскімі партнёрамі наконт некаторых сумесных праектаў у Афрыцы, у тым ліку і ў Зімбабвэ. Ён спытаў, як прасоўваюцца гэтыя пытанні. «Мы ж абяцалі дапамагчы ім у ахове здароўя, сістэму наладзіць. Прыязджаюць іх людзі, будуць у нас рабіць. У тым ліку жонка прэзідэнта, якая адказвае за мацярынскую смяротнасць, дзіцячую смяротнасць, тут мы павінны ім сур'ёзна дапамагчы. У хуткім часе будзем весці перагаворы», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы спытаў, як наладжваецца супрацоўніцтва ў рэальным сектары эканомікі. «Многія краіны і кантыненты пасля нашага візіту зацікаўленыя ў рабоце з намі. Словам, вось гэты комплекс і нават недахопы якія ёсць. Я гляджу ў СМІ: хтосьці ўкідвае ці сапраўды так і ёсць, у нас ёсць праблемы з пастаўкамі нашай тэхнікі на афрыканскі рынак. Каб у нас там парадак быў, жалезны парадак, каб афрыканцы разумелі, што мы людзі добрасумленныя і адказныя, каб мы залішне нічога не патрабавалі», — сказаў Прэзідэнт.

Валерыя СЦЯЦКО.

Парламенцкі дзённік

«Гэта павінна быць міжведамасная дапамога»

Асаблівасці інклюзіўнага навучання

Кіраўнік верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у выязным пасяджэнні кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Пляцоўкай для правядзення быў абраны Полацк.

Напярэдадні пасяджэння Наталля Іванаўна разам з міністрам адукацыі Андрэем Іванцом, міністрам аховы здароўя Дзмітрыем Піневічам, міністрам працы і сацыяльнай абароны Ірынай Касцевіч, кіраўніцтвам Віцебскай вобласці наведала Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Полацкага раёна. Госці азнаёміліся з матэрыяльна-тэхнічнай базай установы, дзе сёння выхоўваюцца 123 дзіцяці да 18 гадоў з цяжкімі формамі інваліднасці і расстройствамі аўтыстычнага спектра. Для іх тут працуюць пяць груп дашкольнага навучання і пяць класаў для школьнікаў. У цэнтры, які ў пачатку гэтага навучальнага года прырос новымі плошчамі дзіцячага садка, ёсць басейн, спартыўная зала, пакой рэкрэацыі з музычным шарыкавым басейнам і дыёднымі лямпамі. Рамонт супрацоўнікі рэабілітацыйнай установы рабілі самі з дапамогай мясцовай улады, партнёраў і валанцёраў, аднак капітальны рамонт у новых памяшканнях яшчэ наперадзе, як і спецыяльнае абсталяванне для навучання і адаптацыі дзяцей з РАС. «Нам важна ведаць, якія ёсць праблемы ў такіх установах адукацыі, і своечасова дапамагчы ім. Гэта павінна быць міжведамасная дапамога — і адукацыі, і мясцовых улад, і прадпрыемстваў рэгіёна», — падкрэсліла кіраўнік верхняй палаты парламента.

Адкрыты дыялог на тэму важнасці інтэграванага навучання дзяцей з асаблівасцямі развіцця ў агульнаадукацыйных установах працягнуўся ў сярэдняй школе № 18 імя Ефрасінні Полацкай. Асаблівую ўвагу Наталля Качанава засяродзіла на напаўненні школ кваліфікаванымі спецыялістамі. Дырэктар школы Канстанцін Шухлеў расказаў, што адміністрацыя абмяркоўвае з бацькамі дзяцей з асаблівымі педагагічнымі патрэбамі метады вядзення ўрокаў. У Полацкім раёне сёння працуе 29 школ, у кожнай з іх ёсць педагог-псіхолаг, які аказвае дапамогу не толькі дзецям, але і іх бацькам. «Роўная адукацыя для ўсіх — галоўны пасыл для сістэмы адукацыі нашай краіны. Неабходна на ранніх этапах выяўляць у дзяцей розныя расстройствы, каб разумець, калі ім патрэбна дапамога спецыяліста для паспяховага асваення вучэбных праграм», — сказала Наталля Іванаўна.

На пасяджэнні кансультатыўнага савета пытанне інклюзіўнага навучання было абмеркавана больш глыбока з удзелам спецыялістаў аховы здароўя, работнікаў сацыяльных службаў, бацькоў, чые дзеці маюць патрэбу ў дапамозе. Міністр адукацыі Андрэй Іванец расказаў, што сёння ў краіне налічваецца 1850 педагогаў-цьютараў, якія суправаджаюць выхаванцаў з аўтыстычнымі расстройствамі і дапамагаюць адаптавацца ў грамадстве. За апошнія пяць гадоў у тры разы павялічылася колькасць дзяцей з РАС — на гэта Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу спецыялістаў аховы здароўя. «Сёння педагогам-псіхолагам трэба ў роўнай ступені працаваць як з дзецьмі, якія маюць асаблівасці, так і з іх бацькамі, дапамагаць зразумець праблему і знайсці яе вырашэнне», — заключыла Наталля Качанава.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Падрабязней пра рабочы візіт Наталлі Качанавай у Полацк — у наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».

АГРЭСІЎНЫЯ НАМЕРЫ ПАД ЛОЗУНГАМІ ДЭМАКРАТЫІ

Заява Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем рэзалюцыі Еўрапейскім парламентам

Савет Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь рашуча асуджае прынятае Еўрапейскім парламентам рэзалюцыі «Далейшыя рэпрэсіі супраць народа Беларусі, у прыватнасці справы А. Пачобута і А. Бяляцкага».

Нягледзячы на ўласныя сістэмныя праблемы, Еўрапейскі парламент працягвае тыражаваць рэзалюцыі ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь, якія скажаюць факты і змяшчаюць шаблонныя і галаслоўныя абвінавачанні, накіраваныя на дыскрэдытацыю міжнароднага іміджу нашай краіны.

Лічым абсалютна непрымальным атаясамленне Еўрапарламентам усяго народа Беларусі з асобнымі грамадзянамі, якія ўчынілі канкрэтныя злачынствы і асуджаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Пераважная большасць беларусаў падтрымлівае дзеючую ўладу і праводзімую ёю палітыку, заснаваную на інтарэсах грамадзян і накіраваную на забеспячэнне стабільнасці, бяспекі і павышэнне дабрабыту грамадства.

Беларускія парламентарыі разглядаюць прынятую рэзалюцыю як недапушчальнае ўмяшанне ва ўнутраныя справы суверэннай і незалежнай дзяржавы. У гэтым жа кантэксце лічым непрымальнымі заклікі да падтрымкі дэструктыўных сіл у Беларусі і за мяжой, дзейнасць якіх накіравана на звяржэнне законнай улады неканстытуцыйным шляхам.

Палажэнні прынятай рэзалюцыі дэманструюць варожую сутнасць палітыкі калектыўнага Захаду. Пры гэтым свае агрэсіўныя намеры ён традыцыйна прыкрывае лозунгамі аб прасоўванні дэмакратыі і абароне правоў чалавека.

Прынятая Еўрапарламентам рэзалюцыя ў чарговы раз дэманструе непрыкрытую крывадушнасць і двайныя стандарты, асабліва на фоне жорсткасці, якая праяўляецца сілавымі структурамі асобных краін — членаў ЕС у адносінах да ўласных грамадзян у ходзе акцый пратэсту, што адбыліся нядаўна і працягваюцца, выкліканых імклівым пагаршэннем сацыяльна-эканамічнай сітуацыі з-за негатыўнага ўплыву санкцый. Факты жорсткага падаўлення пратэстаў застаюцца без увагі еўрапарламентарыяў, галоўнай задачай якіх і з'яўляюцца прадстаўленне і абарона інтарэсаў грамадзян сваіх краін.

Мы патрабуем ад Еўрапейскага парламента спыніць заклікі да працягу ціску і санкцый, якія супярэчаць нормам міжнароднага права і інтарэсам простых грамадзян.

Мы таксама выступаем катэгарычна супраць заклікаў еўрапарламентарыяў да абмежавання ўдзелу беларускіх спартсменаў у міжнародных спаборніцтвах, у тым ліку ў Алімпійскіх гульнях і турнірах УЕФА, што не адпавядае духу алімпійскага руху.

Цвёрда перакананыя, што ўсе спробы ціску на Беларусь бесперспектыўныя, і заклікаем еўрапейскіх парламентарыяў да раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага дыялогу.

Блізкая ўлада

На кантролі — да вырашэння пытання

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА правёў прыём грамадзян у Пінску

На прыём да губернатара прыйшло адразу двое жыхароў прыгараднай вёскі Заполле. Адзін прасіў заасфальтаваць кавалак дарогі, другая — працягнуць нітку цэнтральнай каналізацыі. Як высветлілася, праблемы звязаныя паміж сабой тэрытарыяльна.

Фота БелТА.

На вуліцы Фядотава, пра якую вялася гаворка, ёсць участак працягласцю 500 метраў, вельмі запатрабаваны транспартам. Летам на гэтым кавалку гравійкі пыл не паспявае асядаць, — расказалі людзі. Кіраўнік вобласці прапанаваў старшыні райвыканкама налета выканаць праект і ўключыць паляпшэнне дарогі ў план работы.

Другая заяўніца з гэтай жа вёскі вельмі прасіла паспрыяць з каналізацыяй. Праблема надзвычай актуальная з-за высокага ўзроўню грунтавых водаў у гэтым месцы. Жанчына паведаміла, што людзі гатовыя ўзяць удзел у фінансаванні праекта.

Сышліся на тым, што цяпер варта пачынаць работу па фарміраванні кааператыва, рыхтаваць праект, каб налета пачынаць работу. А з улікам патрэбы ў асфальтаванні па-гаспадарску будзе спачатку пракласці каналізацыйныя трубы, а затым асфальт.

Звярнуліся да губернатара трое грамадзян, якія не маюць работы. Усім траім паабяцалі прапанаваць варыянты працаўладкавання пасля грунтоўнай размовы са спецыялістамі службы занятасці.

На гэты прыём асаблівую надзею ўскладалі жыльцы дома па вуліцы Жалтоўскага, які нядаўна здадзены ў эксплуатацыю. Жыць у новых кватэрах аказалася вельмі некамфортна, бо тэмпература не паднімаецца вышэй за 14—17 градусаў. З-за холаду і сырасці з новых сцен у асобных пакоях адпадаюць шпалеры, у іншых месцах выступае цвіль.

Спецыялісты ў курсе праблемы, але прыбраць непаладкі ў цеплазабеспячэнні пакуль не ўдаецца.

— Гэтым пытаннем займаюцца, усе стандарты неўзабаве будуць забяспечаны, — сказаў навасёлам губернатар і паабяцаў трымаць на кантролі пытанне да яго вырашэння.

Пасля прыёму кіраўнік вобласці наведаў праблемны дом, азнаёміўся з сітуацыяй на месцы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Штотыдзень традыцыйна для вырашэння праблемных пытанняў насельніцтва аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам праводзяць прамыя тэлефонныя лініі.

Прамыя тэлефонныя лініі ў суботу, 18 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. (016) 2269926;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. (021) 2222222;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. (023) 2331237;

• кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. (015) 2735644;

• першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Канстанцінавіч САВІЦКІ. Тэл. (022) 2501869;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. (017) 5004160;

• кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. (017) 2224444.

Добрая навіна

ДАПАМОГА ДА ДНЯ ПЕРАМОГІ

Ветэраны атрымаюць ад 850 рублёў да дзвюх тысяч

У адпаведнасці з рашэннем кіраўніка дзяржавы штогод да Дня Перамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і асобам, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, выплачваецца матэрыяльная дапамога. Сёлета яе атрымальнікамі стане каля 10 тысяч чалавек, паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Памер дапамогі складзе ад 850 рублёў да дзвюх тысяч. На гэтыя мэты з рэспубліканскага бюджэту будзе накіравана каля 10 мільёнаў рублёў. Выплата будзе праводзіцца ў перыяд з 26 красавіка да 4 мая 2023 года.

У параўнанні з 2022 годам памер матэрыяльнай дапамогі павялічаны для ўсіх атрымальнікаў. Такім чынам, у адпаведнасці з пастановай Урада ад 14 сакавіка 2023 года ***выплату ў 850 рублёў атрымаюць асобы, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, а менавіта:***

• члены сем'яў ваеннаслужачых, партызанаў і падпольшчыкаў, загінулых (памерлых), зніклых без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны (асобам, якія не ўзялі новы шлюб, дзецям-інвалідам з дзяцінства (у тым ліку ўсыноўленым, удачаронym), іншым утрыманцам, якім установлены пенсіі на ўказаных падставах у адпаведнасці з заканадаўствам);

• былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны, якім установлена павышэнне пенсіі на ўказаных падставе ў адпаведнасці з заканадаўствам;

• інвалідам з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў.

Выплату ў 2000 рублёў атрымаюць:

• інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, асобы, якія бралі ўдзел у баявых дзеяннях па абароне Айчыны да 3 верасня 1945 г.;

• асобы, якія бралі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943 — 1945 гадах.

Матэрыяльная дапамога ў 1100 рублёў будзе аказана:

• асобам, узнагароджаным ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

• асобам, якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых граніц дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог;

• асобам, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 г. да 27 студзеня 1944 г. і ўзнагароджаным медалём «За абарону Ленінграда», і асобам, узнагароджаным знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда».

Алена КРАВЕЦ.

Надвор'е

У выхадныя ад мінус 10 уначы да плюс 14 днём

На наступным тыдні — да 15 цяпла і дождж

Сакавік — месяц у нас загадкавы. Раніцай туманы і галалёдзіца, днём «прыпякае» не на жарт, а ўначы — месцамі яшчэ сур'ёзныя замаразкі. А ў найбліжэйшыя дні на надвор'е ў Беларусі будзе ўплываць высокі ціск, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Нагадаем, што 14 сакавіка стаў самым цёплым днём з пачатку месяца. У разгар дня слупкі тэрмометраў імкліва рванулі ўвысь, і па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэлася да 14—17 цяпла. Такое цёплае надвор'е стала прычынай актыўнага раставання гурбаў.

У суботу будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 градуса па паўднёвым захадзе да мінус 10 градусаў па ўсходзе краіны. Днём будзе 4—10 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 12 градусаў.

Не чакаецца ападкаў і ў нядзелю. У гэты дзень ноччу і ў ранішнія гадзіны ў асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 8 па паўночным усходзе краіны. Удзень будзе 5—12 цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах — да плюс 14 градусаў.

У ноч на панядзелак абыдзецца без ападкаў. А днём улада пяройдзе да атмасферных франтоў, якія прынясуць у краіну новыя порцыі ападкаў у выглядзе дажджу, месцамі з мокрым снегам. Мінімальная тэмпература паветра па краіне будзе знаходзіцца ў межах ад слабага мінуса да слабага плюса. Дзённыя максімумы будуць вагацца ад плюс 5 па паўночным усходзе да 15 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

У панядзелак ноччу будзе пераважна без ападкаў. Днём у многіх раёнах краіны кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 4, па захадзе — да плюс 6 градусаў. Удзень будзе 5—12 цяпла, па поўдні — да плюс 15 градусаў.

У аўторак уначы на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне будуць назірацца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да плюс 5. Днём будзе ад 5 градусаў цяпла па паўночным усходзе да 14 з плюсам па паўднёвым захадзе краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

«Ваш нумар дала сяброўка, купіце ў нас пыласос»

ШТО ПРАЗМЕРНА — ЗА ТОЕ АДКАЗНАСЦЬ

Персанальныя даныя чалавека — асабістая інфармацыя, паведамляць якую варта далёка не кожнаму, часам нават і сваякам. Выконваючы Закон аб абароне персанальных даных, які прыняты ў Беларусі не так даўно (лістапад 2021-га), многія аператары, якія збіраюць, апрацоўваюць і распаўсюджваюць асабістыя звесткі чалавека, дапускаюць самыя розныя памылкі. З аднаго боку, прысутнічае незаконная апрацоўка персанальных даных асобы некаторымі аператарамі. З іншага — празмерная колькасць атрымання згод на апрацоўку асабістых звестак з мэтай «перастрахоўкі» аператара, расказалі ў Цэнтры.

Між тым, калі разумець патрабаванні закона, карыстацца ім і працаваць у яго межах правільна зусім няцяжка. Тым больш што НЦАПД сістэматычна праводзіць навучанне аператараў, каб яны не парушылі закон па няведанні. За яго парушэнне, дарэчы, прадугледжана адпаведнае пакаранне. За незаконнае распаўсюджванне асабістых звестак прадугледжана пакаранне ў выглядзе штрафу да 200 базавых велічынь або пяці гадоў пазбаўлення волі. Нават за непрыняцце мер па забеспячэнні абароны асабістых звестак можа наступіць адміністрацыйная або крымінальная адказнасць (калі тое прывяло да прычынення шкоды).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дык што ж рабіць чалавеку, якому надакучылі прапановы «неабходных менавіта яму» тавараў ці абяцанні «паказаць кароткі шлях да шчаслівага жыцця» падчас эксклюзіўнай сустрэчы, якія паступаюць на асабісты мабільны нумар тэлефона? У Цэнтры далі некалькі парад на гэты конт.

Удакладніце ў чалавека, які тэлефануе з прапановамі, адкуль у яго вашы персанальныя даныя, у тым ліку нумар мабільнага тэлефона.

Калі вашы даныя перадаў нехта са знаёмых, папрасіце таго, хто вам тэлефануе, спыніць апрацоўку вашых персанальных даных, а знаёмага — не перадаваць звесткі пра вас пабочным асобам.

Калі вы самі некалі пагаджаліся на магчымасць атрымліваць такія званкі, можна адклікаць сваю згоду і таксама патрабаваць спынення апрацоўкі сваіх персанальных даных, у тым ліку іх выдалення з базы аператара.

Калі ваш суразмоўнік сцвярджае, што набраны ім нумар рандомны і абраны выпадковым наборам лічбаў, вы ўсё роўна можаце патрабаваць спынення апрацоўкі сваіх асабістых звестак і накіраваць скаргу на дзеянні такога аператара, калі званок паступіць паўторна.

Будзьце ўважлівыя да сваіх персанальных даных і гэтак жа стаўцеся да асабістай інфармацыі іншых людзей, не перадавайце чужыя персанальныя даныя трэцім асобам без згоды ўладальніка такіх звестак.

КАМУ ПРА ВАС «РАСКАЗВАЕ» АПЕРАТАР

Цэнтр таксама выпускае рознага кшталту тлумачэнні і памяткі для аператараў і грамадзян, дзе нагадвае ім аб правах і абавязках. Не так даўно на сайце НЦАПД з'явіліся тлумачэнні аб праве грамадзян атрымліваць інфармацыю аб даванні сваіх персанальных даных трэцім асобам.

Адпаведна з пунктам 1 артыкула 12 Закона аб абароне персанальных даных, суб'ект персанальных даных мае права атрымліваць ад аператара інфармацыю аб даванні сваіх персанальных даных трэцім асобам адзін раз на працягу каляндарнага года бясплатна, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам, расказалі ў Цэнтры.

— Прадстаўленне такой інфармацыі суб'екту персанальных даных скіравана на забеспячэнне разумення чалавекам (уласнікам даных) межаў і характару апрацоўкі звестак пра сябе і з'яўляецца неабходным кампанентам рэалізацыі прынцыпу празрыстасці апрацоўкі персанальных даных, — растлумачыла **Вольга ШЫБКО, намеснік начальніка ўпраўлення адукацыйных паслуг і сувязяў з грамадскасцю НЦАПД.** — Магчымасць атрымання такой інфармацыі дазваляе таксама рэалізоўваць правы суб'ектаў персанальных даных, у тым ліку патрабаваць спынення апрацоўкі асабістых звестак і абскарджваць дзеянні аператара.

Ірына СІДАРОК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Інфляцыя ў Аргенціне ўпершыню за 30 гадоў перавысіла 100 працэнтаў

Паводле звестак аргенцінскай службы статыстыкі, у лютым інфляцыя ў краіне дасягнула ўзроўню 102,5 працэнта — такім чынам, за апошні год цэны ў краіне выраслі больш як удвая. Гэта здарылася ўпершыню з часоў гіперінфляцыі пачатку 1990-х. Аргенціна ўжо шмат гадоў адчувае эканамічныя цяжкасці, і большая частка насельніцтва тут жыве ў беднасці. Урад спрабуе стрымаць інфляцыю, абмяжоўваючы цэны на прадукты харчавання і іншыя тавары. Нягледзячы на гэта, менавіта кошт прадуктаў харчавання і алкаголю падскочыў найбольш прыкметна — толькі за люты гэтага года рост склаў 9,8 % у параўнанні са студзенем. Аргенцінскія СМІ мяркуюць, што галоўнай прычынай такога рэзкага скачка сталі цэны на мяса — яны ўзраслі на 20 % усяго за месяц. Неспрыяльныя ўмовы надвор'я, зацяжная спякота і засуха (у Аргенціне цяпер пачатак восені) сур'ёзна паўплывалі на пагалоўе хатняй жывёлы і ўраджай, паведаміла мясцовае выданне Ambito.

У Францыі заявілі аб уступленні краіны ў перыяд ваеннай эканомікі

Такое меркаванне выказаў кіраўнік гендырэкцыі па ўзбраеннях пры французскім абаронным ведамстве Эмануэль Шыва, паведаміла ТАСС. «Мы ўступілі ў ваенную эканоміку. З чэрвеня мы з міністрам узброеных сіл тройчы сустракаліся з усімі прадстаўнікамі нашай абаронна-прамысловай базы. Мы стварылі пяць рабочых груп, якія прывялі да першых канкрэтных вынікаў, напрыклад, з пункту гледжання стратэгічных запасаў, скарачэння тэрмінаў выканання заказаў, паскарэння вытворчасці», — заявіў Шыва. Ён адзначыў, што прадпрыемствы ВПК Францыі цяпер працуюць над тым, каб павялічыць і паскорыць выпуск сваёй прадукцыі. Шыва таксама паведаміў, што ўрад Францыі працягвае закупкі зброі і боепрыпасаў. Так, летась у прадпрыемстваў ВПК было заказана звыш 200 зенітных ракет Aster, прыкладна столькі ж супрацьтанкавых ракет сярэдняй далёкасці, а таксама 100 ракет для ЗРК Mistral. Як вядома, у мінулым месяцы прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон заклікаў еўрапейскія краіны нарасціць інвестыцыі ў абаронны сектар.

Гітарыст гурта Queen Браян Мэй атрымаў рыцарскі тытул

Гітарыст рок-гурта Queen Браян Мэй атрымаў тытул рыцара з рук караля Вялікабрытаніі Карла III і цяпер будзе афіцыйна называцца сэрам, паведаміла «Бі-бі-сі». Мэй стаў рыцарам за заслугі ў галіне музыкі і дабрачыннай дзейнасці. Паводле традыцыі, пры пасвячэнні ў рыцары кароль стукае плоскім бокам мяча па плячы чалавека, які атрымлівае тытул. Браян Мэй вядомы не толькі як рок-гітарыст, але і як актыўны барацьбіт за правы жывёл. Разам з гітарыстам на цырымонію прыйшла яго жонка — брытанская актрыса Аніта Добсан, яна найбольш вядомая як выканаўца ролі Энджы Уотс у папулярнай мыльнай оперы «Жыхары Ist-Энда».

ПАЎНОЧНЫ ВІНАГРАД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Была сярод падобных даных аб нашай краіне і такая «рэгалія»: Беларусь — самая паўночная краіна, дзе можна вырошчваць вінаград. Была, таму што ў сувязі са змяненнем клімату гэтая мяжа адсунулася на поўнач.

— Паўночная мяжа вырошчвання вінаграду пачала адсоўвацца гадоў 30 таму. Сёння вінаград ужо вырошчваюць і ў раёне Санкт-Пецярбурга, і ў Прыбалтыцы, Швецыі, Нарвегіі — амаль да 60-й паралелі, — тлумачыць **кіраўнік клуба «Паўночны вінаград», навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства» Уладзімір УСЦІНАЎ.**

І гэта звязана не толькі са змяненнем клімату, адзначыў навуковец. Гадоў 30-40 таму селекцыянеры пачалі атрымліваць сарты вінаграду з ультраранніх тэрмінам паспявання, і за кошт гэтага змянілася мяжа распаўсюджвання дадзенай культуры. Чатыры дзесяцігоддзі таму гэтая мяжа дакладна праходзіла праз Магілёў, Мінск і Гродна: на поўдзень ад яе вінаград рос, на поўнач — ужо не, як ні старайся. У нашы дні вінаград можна вырошчваць па ўсёй тэрыторыі Беларусі. І ўсё ж асартымент сартоў на Віцебшчыне істотна ніжэйшы за Берасцейшчыну, бо вегетацыйны перыяд, які ёсць «у запасе» ў раслін у гэтых двух рэгіёнах, адрозніваецца ў сярэднім на цэлых тры тыдні.

Вінаград фермеры і проста аматары вырошчваюць у асноўным у цяпліцах.

БЕЛАРУСКІ — СМАЧНЕЙШЫ!

Аднак у нашай кліматычнай зоне і сёння вырошчванне вінаграду патрабуе не толькі працавітасці, але і ведаў, і творчага падыходу. Хто і навошта вырошчвае гэтую цеплалюбівую культуру ў нашай зусім не паўднёвай краіне?

У асноўным гэта аматары, распавядае Уладзімір Мікалаевіч. Проста гаспадары прысядзібных і дачных участкаў. Ёсць фермерскія гаспадаркі, якія зрабілі стаўку на гэтую нетыповую для Беларусі культуру. Яны вырабляюць вінаград для рэалізацыі на рынку, у многіх заключаны дагаворы з кафэ і рэстаранамі. Вінаград фермеры і проста прыватнікі вырошчваюць у асноўным у цяпліцах. Больш за ўсё такіх цяпліц — пад Пінскам, Гомелем, Лідай, на Берасцейшчыне. Зрэшты, аматары — гаспадары асабістых «сотак» — вырошчваюць вінаград і вакол Мінска (Салігорск, Слуцк, Капыль), і ў Гродзенскай вобласці, і нават на Віцебшчыне.

У асноўным у Беларусі пераважаюць сталовыя сарты расійскай і ўкраінскай селекцыі. Справа ў тым, што вінныя сарты патрабуюць адкрытага грунту, а ў адкрытым грунце ў нашых шыротах вырасціць вінаград неверагодна складана, таму дадзены кірунак пакуль развіваецца не надта актыўна. Хоць некаторыя аматары спрабуюць і гэта — у такім выпадку яны выкарыстоўваюць старыя французскія сарты: класіку, створаную многія дзесяцігоддзі таму, распавёў суразмоўнік. Беларуская селекцыя вінаграду актыўна развівалася ў 1960-я гады, але на сённяшні дзень у ёй няма неабходнасці: пакуль эканамічна мэтазгодна засяродзіцца на больш прыдатных для нашай кліматычнай зоны культурах, а што датычыцца вінаграду — проста адаптаваць ужо існуючыя сарты пад нашы ўмовы. А ў цэлым, па прагнозах спецыялістаў, развіццё вінаградарства ў Беларусі і далей будзе ісці з акцэнтам на сталовыя сарты. Таму што гэта — сапраўды атрымліваецца.

— Па смакавых і спажывецкіх якасцях беларускі вінаград смачнейшы за імпартны, — адзначае Уладзімір Усцінаў. — І разнастайнасць смакаў значна багацейшая, чым тыя камерцыйныя сарты, якія «прыязджаюць» у Беларусь. Імпартны вінаград здымаецца ў стадыі недаспеласці і даспявае ўжо ў дарозе. Плюс апрацоўка прэпаратамі, каб прадухіліць гніенне. Беларускі вінаград сёння знялі з расліны, а самае позняе — заўтра ён ужо рэалізуецца пакупніку.

Таннейшым айчынны вінаград у параўнанні з імпартным быць не можа — тая ж цана або трохі даражэй. Як і любы фермерскі прадукт. Справа і ў аб'ёмах вытворчасці, і ў ступені механізаванасці вытворчых працэсаў на буйных сельгаспрадпрыемствах у параўнанні з падворкам прыватніка. Затое ў наяўнасці ўсе плюсы прадукту «арганік»: экалагічна чыстая вытворчасць, «самая першая свежасць». А таксама той факт, што прыватнік, у адрозненне ад буйных вытворцаў, можа дазволіць сабе, выбіраючы сарты для вырошчвання, залажыць у аснову гэтага выбару не толькі (і не столькі) іх прадукцыйнасць, устойлівасць да хвароб і лёжкасць, а ў першую чаргу смакавыя якасці. Гэтым і тлумачыцца разнастайнасць сталовых сартоў вінаграду айчыннай вытворчасці — ад малочна-белага, зялёнага, далікатна- і ярка-ружовага да вішнёвага, бардовага, фіялетавага і сінявата-чорнага, з костачкамі і без костачак.

Беларускі вінаград — прадукт сезонны, як, уласна кажучы, і наканавана вінаграду. Пакаштаваць яго можна ў жніўні-верасні ў першую чаргу на рэгіянальных рынках — у сталіцу ён не заўсёды «даязджае». І спецыялісты раяць выбіраць менавіта яго: па смаку і карыснасці ён адназначна выйграе. Зрэшты, акінуць позіркам усё вінаградарства нашай краіны і параўнаць смак зручней за ўсё на штогадовай «вінаграднай» выставе-кірмашы ў Самахвалавічах — яна праходзіць у жніўні, на яе прывозяць гронкі, а таксама ўласнае віно і разынкі з усёй Беларусі. Дарэчы, на яе прыязджаюць і вінаградары з суседняй Расіі, іншых краін. Яшчэ адна (дарэчы, больш блізкая па часе) важная дата для беларускіх вінаградараў — у красавіку: калі штогод на пляцоўцы перад Інстытутам пладаводства адкрываецца продаж саджанцаў найлепшых і незвычайных сартоў вінаграду. Заўважым, што ў Інстытуце пладаводства ў Самахвалавічах сабрана калекцыя з 500 сартоў вінаграду, якія вырошчваюцца ў Беларусі. А на прысядзібных участках беларускіх аматараў вінаградарства сёння расце ўжо 800 сартоў. Вінаградарства ў нашай краіне развіваецца не адно дзесяцігоддзе. І ўжо больш за 20 гадоў — з 2000 года — існуе клуб «Паўночны вінаград».

ПРАКТЫКАВАННЕ ДЛЯ РОЗУМУ

— Вырошчваю трыццаць сартоў вінаграду. Напрыклад, радуе «Юбілей Новачаркаска» — вага гронкі па 2 кг, а кожная ягадка — 5 см, — успамінае напярэдадні новага садова-агароднага сезона мінулыя ўраджаі адзін з найстарэйшых удзельнікаў клуба «Паўночны вінаград» Іван ЯЛОВІК. — Між тым, Беларусь знаходзіцца за межамі прамысловай зоны вырошчвання вінаграду. І дораць радасць не толькі сакавітыя гронкі, але і тое, што і ў нашым клімаце, калі прыклаці да справы веды і працавітасць, вінаградник можа даваць высокія ўраджаі.

Наогул, вінаградник — гэта цяжкая праца нават у краінах з аптымальным для такой культуры кліматам. Але мужчын і жанчын у клубе вінаградараў — практычна пароўну.

— Лічыцца, што не жаночая гэта справа — вінаград вырошчваць. Але я спраўляюся, — усміхаецца Людміла ЮЗАФАТАВА, яшчэ адна з найстарэйшых беларускіх вінаградараў. — У мяне на ўчастку — 150 сартоў вінаграду, а кустоў — больш за 200. Вінаград — тая культура, якая ўлюбляе ў сябе і не адпускае: калі атрымаеш ураджай адзін раз, спыніцца ўжо немагчыма.

Людміла Васілеўна распавядае, што вырошчваннем вінаграду захапілася ў даволі сталым узросце — раней і не думала, што будзе нешта вырошчваць. Трэба сказаць, людзей, чый жыццёвы шлях да сустрэчы з гэтай культурай не быў звязаны з працай на зямлі, у клубе беларускіх вінаградараў большасць. А потым сустрэча адбылася — і яны ўлюбіліся ў гэтую няпростую справу. І менавіта ім скарылася вяршыня — атрыманне высокіх ураджаяў «сонечнай ягады» ў халодным для згаданай культуры клімаце.

— Любоў да зямлі ў мяне «родам з дзяцінства»: наш род — сялянскі. А чаму менавіта вінаград? Ды проста ў нашым клімаце гэта сур'ёзная праца для розуму.

Яшчэ ў антычнасці старажытныя лекары называлі вінаград «лазой даўгалецця». І справа не толькі ў хімічным складзе гэтай ягады і яе карысці для здароўя...

— Калі пасадзіць вінаград «наўдачу», выніку не будзе, — кажа Уладзімір Усцінаў. — Гэта культура, максімальна адчувальная да клопату і ўвагі. Ні адна расліна так не рэагуе на правільны догляд, як вінаград. Трэба разумець, што робіць вінаградар і для чаго ён тое робіць. Таму ўраджай вінаграду, асабліва ў нашых шыротах, — узнагарода за працу не толькі фізічную, але і разумовую. За пастаяннае паглыбленне і пашырэнне сваіх ведаў і ўдумлівы падыход да працэсу вырошчвання лазы. Нядзіўна, чаму гэтая культура прыцягвае многіх. Вінаградарства ў нашай краіне будзе развівацца.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Будзь у курсе!

Адкрываецца паляванне на птушыную дзічыну

З 11 сакавіка (з другой суботы месяца) у краіне стартуе веснавы сезон палявання на птушыную дзічыну. Згодна з Правіламі палявання, веснавы сезон прадоўжыцца да 14 мая (другая нядзеля месяца), але агульная працягласць веснавога сезона палявання не можа перавышаць 28 дзён. Пра гэта нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету.

Канкрэтныя тэрміны вызначаюцца кожным карыстальнікам паляўнічых угоддзяў самастойна ў залежнасці ад наяўных прыродна-кліматычных умоў (пачатак веснавога пралёту, наяўнасць аб'ектаў палявання ў паляўнічых угоддзях і г. д.) шляхам выдання лакальнага нарматыўнага прававога акта да пачатку сезона палявання.

Ружэйнае паляванне на ненармаваныя віды паляўнічых жывёл дазволена ў суботу, нядзелю, дзяржаўныя святы, святочныя дні, аб'яўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь непрацоўнымі, і асобныя рабочыя дні ў выпадку іх пераносу Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь на выхадныя дні. Акрамя таго, паляўнічыя гаспадаркі могуць устанаўліваць на сезон палявання дадатковыя дні тыдня, дазволеныя для палявання (не больш за два).

Веснавое паляванне не такое масавае і папулярнае, як, напрыклад, летне-восеньскае «па пяры» або восеньска-зімовае на пушных паляўнічых жывёл. Разам з тым аматараў такога таксама нямала.

Традыцыйна падчас веснавога палявання паляўнічым дазволена здабываць:

пралётных (якія мігруюць) гусей — гуся-белалобага, гуся-гуменніка, гуся шэрага, канадскую казарку любога полу; самцоў (качароў) качак — крыжанкі, свіязі, гогаля, шыраканосак, чарнец і чубатай, чырка-траскунка і чырка-свістунка, качкі шэрай, самцоў слонкі «на цязе».

Адначасна пры паляванні на гусей і качараў качак дазволена здабыча баклана, голуба шызага, чаплі шэрай і белай вялікай.

Акрамя таго, пры любым законным знаходжанні ў паляўнічых угоддзях у мэтах палявання паляўнічым дазваляецца таксама здабыча ваўка, шакала, лісіцы, янотападобнага сабакі, вароны шэрай, сарокі з выкарыстаннем спосабаў і прылад палявання, дазволеных для палявання на паляўнічых жывёл.

Паляванне на гусей дапускаецца ў светлы час сутак, акрамя перыяду з 12 да 18 гадзін, спосабамі — з засады толькі са скрадка (або з выкарыстаннем маскіровачнага халата) і абавязкова з прынаджваннем (з дапамогай вабіка і падсаднога гусака, профіляў або пудзілаў гусака).

Паляванне на качараў качак таксама дазволена ў светлы час сутак, акрамя перыяду з 12 да 18 гадзін, спосабамі — з засады толькі са скрадка (або з выкарыстаннем маскіровачнага халата) і толькі з прынаджваннем (з дапамогай падсаднай качкі або пудзілаў качак і вабіка). Выкарыстанне толькі вабіка без пудзіла або толькі пудзіла без вабіка не дапускаецца. У ходзе правядзення дадзенага палявання дазваляецца здабываць толькі падляцелых або падсеўшых (якія селі на ваду) да падсадной качкі або пудзіла качараў качак.

Паляванне на слонку дапускаецца ў перыяд часу з 18 да 22 гадзін спосабам — з засады («на цязе»).

У якасці прылад палявання дазваляецца выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю, зараджаную патронамі са шротам. Для вышуку і падачы здабытай дзічыны дапускаецца выкарыстанне паляўнічых сабак — тэр'ераў, такс, лягавых, спаніэляў, рэтрыверaў, водных сабак.

У перыяд забароны на выкарыстанне грамадзянамі маламерных суднаў у рыбалоўных угоддзях у веснавы сезон палявання паляўнічым дазваляецца выкарыстоўваць маламерныя судны без рухавіка ў ўстаноўцы і (або) зняцця падсадных качак, пудзілаў, профіляў і пад'ёму здабытай дзічыны.

У працэсе веснавога палявання дапускаецца здабыча толькі паляўнічых відаў птушак, указаных у паляўнічай пуцёўцы. Здабыча птушак іншых відаў альбо самак качак і слонкі не дапускаецца і з'яўляецца незаконным паляваннем, што цягне адміністрацыйную (частка 1 артыкула 16.27 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях) або крымінальную (артыкул 282 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) адказнасць, а таксама абавязкам кампенсацыі шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю ў выніку незаконнай канфіскацыі гэтай жывёлы.

У Дзяржінспекцыі нагадалі таксама аб забароне нашэння і (або) выкарыстання ў паляўнічых угоддзях пры правядзенні палявання на паляўнічых жывёл ненармаваных відаў паляўнічай зброі з нарэзным ствалом (стваламі), паляўнічых лукаў і арбалетаў, а таксама патронаў з кулямі або карцеччу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Конкурсы

ПАСПЕЙЦЕ ЗАЯВІЦЬ ПРА ТАЛЕНТ

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё распачаў прыём заявак на ўдзел у XII Рэспубліканскім творчым радыёконкурсе «Маладыя таленты Беларусі», новы сезон якога пройдзе ў красавіку-маі пад знакам Года міру і стваральнай працы.

Узяць удзел у творчым спаборніцтве запрашаюцца хлопцы і дзяўчаты ад 10 да 25 гадоў. Заявіць пра сябе можна ў адной з дзевяці намінацый: «Эстрадны вакал. Салісты», «Эстрадны вакал. Ансамблі», «Спадчына. Салісты», «Спадчына. Ансамблі (вакальныя/вакальна-інструментальныя)», «Акадэмічны вакал. Салісты», «Інструментальная музыка, народныя інструменты. Салісты», «Інструментальная музыка, акадэмічныя інструменты. Салісты», «Інструментальная музыка. Аркестры», «Харавая творчасць».

Праслухоўванне ўдзельнікаў намінацый «Інструментальная музыка. Аркестры» і «Харавая творчасць» праводзіцца дыстанцыйна, а ўсе астатнія намінацыі прадугледжваюць камбінаваную форму ўдзелу. Журы будзе вывучаць папярэдне запісаныя відэавыступленні і запрашаць канкурсантаў на вочныя сустрэчы ў Вялікай студыі Дома радыё, у тым ліку і ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі.

Для ўдзелу ў радыёконкурсе трэба да 27 сакавіка ўключна даслаць сваю заяўку з усімі неабходнымі дакументамі, суправаджальным пісьмом і відэазапісам выканання твора на адрас: 220114, г. Мінск, вул. Чырвоная, д. 4 ці на электронны адрас talentbelarus@gmail.com, пазначыўшы «Маладыя таленты Беларусі — 2023». Падрабязнасці шукайце на сайце Першага нацыянальнага тэлеканала або тэлефануйце: +375 (17) 348-32-05, +375 (29) 609-94-51, +375 (29) 640-46-78.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 187

Пераможцамі першынства Беларусі па шашках-64 сярод хлопчыкаў і дзяўчынак 2015 г. н. і маладзейшых сталі Іван Невар (Орша) і Вераніка Целяўная (Гродна).

У мінулым выпуску мы паведамлялі пра першынство Беларусі па шашках-64 сярод юнакоў і дзяўчат да 11, 14, 17, 20 і 27 гадоў. Сёння прапануем паглядзець некалькі цікавых фрагментаў.

№ 39 А. Сакалова — В. Нікалаева
Белыя простыя: e1, b2, f2, h2, a3, c3, e3, g3, b4, f4, a5 (11)
Чорныя простыя: d4, c5, e5, b6, d6, h6, c7, e7, g7, b8, f8 (11)
1.g3-h4 e5:g3 2.h2:f4 e7-f6 3.c3:e5 f6:d4 4.e1-d2 f8-e7 5.d2-c3 e7-f6 6.c3:e5 f6:d4 7.b2-c3 d4:b2 8.a3:c1 c5:a3 9.c1-b2 a3:c1 10.e3-d4 c1:g5 11.h4:h8+

№ 40 А. Спірына — П. Петрусёва
Белыя простыя: e1, d2, h2, a3, c3, e3, g3, b4, h4 (9)
Чорныя простыя: c5, e5, b6, d6, f6, h6, e7, b8, f8 (9)
1.b4-a5 f8-g7 2.a5:c7 e5-d4 3.c7:e5 d4:b2 4.a3:c1 f6:f2 5.g3-f4+

№ 41 І. Бародзіч — М. Чэрнік
Белыя простыя: c1, g1, b2, d2, f2, a3, e3, d4, f4 (9)
Чорныя простыя: a5, c5, g5, d6, h6, a7, e7, d8, f8 (9)
1...e7-f6 2.d4:b6 a7:c5 3.b2-c3 f6-e5 4.f2-g3 g5-h4 5.c1-b2 h4:d4 6.g1-h2 e5:g3 7.c3:c7 d8:b6 8.h2:f4 h6-g5 9.f4:h6 f8-g7 10.h6:b4 a5:e1+

Наступная кампазіцыі складзены вядучым аддзела.

№ 42



№ 42
Белыя простыя: g1, b4, a5, c5, f6 (5)
Чорныя простыя: e3, g3, h4, g5, a7, c7 (6)

№ 43
Белыя простыя: e1, f2, g5, f6, h6, a7 (6)
Чорныя простыя: a3, d4, d6, b8, f8, h8 (6)

№ 44
Белыя простыя шашкі: d2, h2, a3, d4, h4, b6, h6 (7)
Чорныя простыя шашкі: b4, f4, c5, d6, f6, a7, e7, d8 (8)

№ 45
Белыя простыя: 47, 48, 38, 33, 27, 24, 17 (7)
Чорныя простыя: 36, 31, 34, 23, 15, 7, 8, 9 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 186 ад 03.03.2023.

№ 31 1.d2-e3 f4:d2 2.c1:g5 a5-b4 3.a3:c5 c7-d6 4.c5:e7 d8:h4 5.g3-f4 e5:e1 6.g1-f2 e1:g3 7.h2:f4 h4-g3 8.f4:h2+

№ 32 1.44-39 34:43 2.49:38 32:43 3.41-37 31:42 4.35-30 24:35 5.15:31 26:37 6.36-31 37:26 7.45-40 35:44 8.50:37+

№ 33 1.f2-g3 h2:d2 2.c1:e3 h6:d2 3.a3:e3+

№ 34 1.c5-d6 e3:e7 2.f6:d8 h4:d4 3.f4-e5 d4:f6 4.d8:a1+

№ 35 1.e7-f8 a5:c3 2.e3-d4 g5:e7 3.f8:d2 h2:f4 4.d2:g5 h6:f4 5.f2-e3 f4:d2 6.e1:a1+

№ 36 1.e7-f8 e3:e7 2.f8:g5 h6:f4 3.f2-e3 f4:d2 4.e1:h8+

№ 37 1.c5-d6 e3:e7 2.d2-c3 b2:d4 3.f2-e3 d4:f2 4.e1:h6 g5-h4 5.h6-f4 b8-a7 6.f4-c7+

№ 38 1.e5-f6 g7:c3 2.a5:g5 h6:f4 3.f2-e3 f4:d2 4.e1:a1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

ШТО ПАЧЫТАЦЬ У ЧАСОПІСЕ «АЛЕСЯ» Ў САКАВІКУ?

ЦІ ЛЁГКА ЖАНЧЫНЕ БЫЦЬ АФІЦЭРАМ?

Алеся Сурынт ні ў дзяцінстве, ні ў студэнцкія гады не задумвалася аб службе ў органах унутраных спраў. Але лёс склаўся так, што сёння Алеся Люцыянаўна — палкоўнік міліцыі.

— Наша падраздзяленне — аддзел двухбаковага супрацоўніцтва ўпраўлення міжнароднага супрацоўніцтва МУС. Мы ўзаемадзейнічаем з праваахоўнымі органамі іншых краін, аказваем дапамогу розным службам у вырашэнні многіх пытанняў, — расказала яна.

Па словах Алесі Сурынт, у міліцыі ёсць падраздзяленні, якімі кіруюць жанчыны, і такіх становіцца ўсё больш.

— Пры гэтым варта адзначыць, што ў міліцыі няма жанчын і мужчын. Усе — супрацоўнікі органаў унутраных спраў. І ў гэтым ёсць сэнс: калі ты ідзеш у сілавое ведамства, ты павінен разумець, што ты ідзеш служыць. А служба не прадугледжвае пэўных «я». Само слова — «служэнне» — сведчыць аб тым, што ты сабе не належыш.

«МЫ НЯСЁМ У СВЕТ ДАБРО...»

Спявачка і аўтарка песень, салістка гурта AURA Юлія Быкава не баіцца прымяраць новыя вобразы і ўзнімаць актуальныя тэмы. Але разам з тым спявае пра каханне, важнасць заставацца верным і сабе, і сваім поглядам пры любых абставінах. У гутарцы з журналістам Юлія распавяла, як прыйшла ў мастацтва, наколькі адчувае сябе сёння публічнай персонай, у кім знаходзіць апору ў жыцці і дзе папаўняе сілы. А таксама падзялілася сакрэтамі сямейнай гармоніі, расказала, што цэніць у мужчынах.

Па словах гераіні, у яе і мужа, кампазітара Яўгена Алейніка, агульная ключавая матывацыя ў творчасці:

— Перш за ўсё гэта жаданне дзяліцца з іншымі тым, што мы думаем і адчуваем. Мы нясём у свет дабро, святло, любоў і радасць. Нам хочацца, каб як мага большая колькасць людзей гэтым прасякнулася.

«ЖАНЧЫНЫ — НЕРАЗГАДАНАЯ ЗАГАДКА»

Аўтар шматлікіх кніг паэзіі і прозы, публіцыст, журналіст Навум Гальпяровіч нядаўна адзначыў 75-годдзе і працягвае заставацца ў выдатнай творчай форме. Што дапамагае вядомаму майстру жыць па-за ўзростам? Як з вышыні гадоў творца ставіцца да паэзіі? Ці канкуруюць паміж сабой літаратура і журналістыка? Што ёсць жаноцкасць, і ці існуе каханне на ўсё жыццё? Пра гэта і многае іншае — у шчырай размове з пісьменнікам.

— Жаноцкасць для мяне — гэта прыгажосць, пяшчота, вернасць, — дзеліцца на старонках «Алесі» Навум Гальпяровіч. — Так, сёння няма рыцараў і свецкіх дам, я стараюся зразумець імкненне сучаснай жанчыны быць самастойнай, паспяховай, самадастатковай. Але што зробіш з «кніжным» чалавекам? Хачу прысвячаць ёй вершы як цудоўнаму стварэнню прыроды. Урэшце, жанчыны для мяне і да гэтага часу ёсць неразгаданай загадкаю.

ЯК ЗНАЙСЦІ РОДНУЮ ДУШУ?

Чаму людзі ў сучасным свеце так часта пакутуюць ад адзіноты? Ці здольныя сацсеткі выратаваць ад яе? Якія ўменні дапамагаюць лягчэй знаходзіць родную душу ў вірлівым свеце? Адказы на гэтыя пытанні шукайце ў гутарцы журналіста «Алесі» з кандыдатам псіхалагічных навук, дацэнтам кафедры інавацыйнага кіравання Інстытута бізнесу БДУ, коўчам Наталляй Плаўнік.

САКРЭТЫ ХАРЧАВАННЯ, МОДА І ДОМ

З сакавіцкага нумара «Алесі» вы даведаецеся, што такое візуальны шум у памяшканні і як ад яго пазбавіцца. Атрымаеце парады спецыяліста, як палепшыць знешнасць і самаадчуванне, адкарэкціраваўшы свой рацыён. Наша падборка стыльных жаночых паліто на вясну дапаможа выглядаць модна і прывабна. Вы навучыцеся вязаць скандынаўскую хустку, а таксама прачытаеце, чым карысныя арэхі, як правільна даглядаць архідэю, ды пра іншыя цікавінкі.

Алена ВАЛЕР'ЕВА.

«Са "Звяздою" — спадручней!»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або на I паўгоддзе 2023 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2023 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем прасаў Holt HT-IF-010 і суперпрыз — вертыкальны пыласос Deerma DX700S. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 29 красавіка 2023 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2023 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або на I паўгоддзе 2023 года. Пасля 30 чэрвеня 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ад падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 38 ад 25 лютага 2023 года.

Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4288 ад 15.02.2023 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

